Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42

DOI:10.17951/sb.2015.9.237


Ігар Капылоў

Narodowa Akademia Nauk Białorusi (Mińsk, Białoruś)
National Academy of Sciences of Belarus (Minsk, Belarus)

E-mail: iharkap@gmail.com

# Беларуская тапанімія ў часы Рэчы Паспалітай

*Toponimia białoruska w okresie Rzeczypospolitej*

*Belarusian Toponymy at the Time of Rzeczpospolita*

Беларуская тапанімія ўяўляе сабой складаную сістэму комплексаў уласных геаграфічных назваў, звязаных паміж сабой характарам і семантыкай лексічных асноў, абумоўленых рэаліямі сацыяльна-палітычнага, культурнага і гаспадарчага развіцця грамадства ў розныя гістарычныя перыяды. Найбольш адметным у гісторыі станаўлення, развіцця і функцыянавання беларускіх тапонімаў з'яўляецца перыяд Рэчы Паспалітай, якія вядзе свой пачатак ад Люблінскай уніі 1569 года і заканчваецца трэцім падзелам федэратыўнай дзяржавы ў 1795 годзе. Гэты перыяд характарызуецца надзвычайным дынамізмам і зменлівасцю тапанімічнай сістэмы, як у якасных, так і ў колькасных адносінах, што абумоўлена зменлівасцю палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, рэлігійнай, культурнай і моўнай сітуацыі. Аналіз пісьмовых крыніц другой паловы XVI – канца XVIII стагоддзяў дазваляе прасачыць сувязь паміж узнікненнем ўласных геаграфічных найменняў і грамадска-гістарычнымі з'явамі, што іх спарадзілі, адшукаць сацыяльна-лінгвістычныя фактары, дзякуючы якім за геаграфічнымі аб'ектамі замацаваліся пэўныя назвы, устанавіць змены у структуры тапонімаў і іх фанетыка-арфаграфічным абліччы. Гэта ў сваю чаргу садзейнічае вырашэнню адной з актуальных задач сучаснай анамастычнай навукі – правядзенню максімальна поўнага сістэмнага апісання беларускай нацыянальнай тапаніміі на шырокім лінгвагістарычным і культурным фоне.

Найбольш інфармацыйнымі крыніцамі па тапаніміі перыяду Рэчы Паспалітай з'яўляюцца помнікі дзелавой пісьменнасці, апублікаваныя ў серыі *Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*, *Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею*, *Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России*, *Акты, относящіеся къ исторіи*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



*Западной Россіи, собранные и изданные археографическою комисiею*. Каштоўны тапанімічны матэрыял змяшчаюць таксама картаграфічныя крыніцы: *Беларусь у канцы XVI ст.*, *Віцебскі павет у канцы XVI ст.*, *Аршанскі павет у канцы XVI ст.*, *Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі і сумежных тэрыторый у сярэдзіне XVIII ст.*, а таксама працы такіх даследчыкаў, як: К. Бучэк[1], С. Александровіч[2], М. Ф. Спиридонов[3], Я. Ахманскі[4], М. Тапольская[5], Я. Якубоўскі[6]. Выбар крыніц прадыктаваны некалькімі прычынамі: па-першае, яны ўтрымліваюць вялікую колькасць уласных геаграфічных найменняў, дакладна датаваных і тэрытарыяльна лакалізаванх; па-другое, дзелавыя дакументы (справаводчыя запісы гарадскіх, земскіх, замкавых і копных судоў, інвентары маёнткаў і іншых уладанняў, дэкрэты сеймаў, уводныя і завяшчальныя лісты, рэвізійныя акты, льготныя, межавыя, міравыя граматы, купчыя і інш.) адлюстроўваюць найбольш аб'ектыўныя формы тапонімаў. Такім чынам, старажытныя пісьмовыя дакументы дазваляюць прасачыць эвалюцыю уласных назваў геаграфічных аб'ектаў на працягу некалькіх стагоддзяў і выявіць іх змены на лексічным, фанетыка-арфаграфічным і граматычным узроўнях.

## Лексіка-семантычныя асаблівасці тапонімаў

Вялікая колькасць найменняў, засведчаных у дакументах перыяду Рэчы Паспалітай, была ўспадкавана з папярэдніх эпох. Разам з тым гаспадарчае развіццё беларускіх земель у другой палове XVI – першай палове XVII стст. абумовіла ўзнікненне новых тапонімаў. Сутнасць развіцця тапанімічнай сістэмы ў гэты час зводзілася да звужэння ўдзельнай вагі ў працэсе тапонімаўтварэння апелятыўнай лексікі (асабліва прыродна-геаграфічнай) і росту назваў, матываваных антрапонімамі, што было абумоўлена інтэнсіўным развіццём прыватнага зем-

[1] K. Buczek, *Dzieje kartografii polskiej od XV do XVIII wieku. Zarys analityczno-syntetyczny*, Wrocław: Zakład Narodowy. im. Ossolińskich, 1963.

[2] S. Alexandrowicz, *Miasta i miasteczka Białorusi i Litwy około 1650 r.* (*w granicach Wielkiego Księstwa Litewskiego z 1582 r.*), [Mapa], [w:] *Idem*, *Geneza i rozwój sieci miasteczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w.*, „Acta Baltico-Slavica" 1970, 7, s. 47–108.

[3] M. F. Spiridonow, *Беларусь в конце XVI в.* [Karta s ukazatielem], [w:] *Idem*, *Zakrieposzczenije kriestjanstwa Biełarusi* (*XV–XVI ww.*), Minsk: Nawuka i technika, 1993.

[4] J. Ochmanski, *Powiat kobryński II poł. XVI w.* [Mapa], [w:] *Idem*, *Gospodarka folwarczna dóbr hospodarskich na Kobryńszczyznie: Studium z dziejów folwarku w dobrach na Białorusi. Koniec XV* – pocz. XVII w., „Kwartalnik historii kultury materialnej" 1958, 3, Warszawa.

[5] M. B. Topolska, *Dobra dereczyńskie od XV do połowy XVII w.*, „Zeszyty Naukowe UAM w Poznaniu. Historia" 1971, z. 11, s. 45–70.

[6] J. Jakubowski, *Mapa Wielkiego Księstwa Litewskiego w połowie XVI wieku*, Kraków: Akademia Umiejętności, 1928.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



леўладання і адпаведна шырокім замацаваннем ў тапаасновах асабовых імён землеўладальнікаў[7].

Адметнай рысай беларускай тапанімічнай сістэмы пачатковага этапу Рэчы Паспалітай выступае з'яўленне ў канцы XVI стагоддзя тапонімаў з каталіцкімі імёнамі ў аснове, колькасць якіх на працягу XVII і XVIII стагоддзяў нязменна павялічваецца: *Butrimanczy*, s. / *Butrimańskie*, s. / *Botrimanskie*, s. / *Butrimanskie*, s. / *Butrymanskie*, s. / *Butrimancy,* [s.] (АВАК, XIV, 315–324, 327; 1585, Лидск пов.); *Яново*, [им.] / *Janowo*, [им.] / *Janów*, [им.] (АВАК, IV, 87, 88, 133, 143, 278, 303, 323, 327, 353, 367, 1670, 1671, 1672, 1702, 1710, Берест. воев.); *Jasiewiczy*, folw. / *Jasiewicze*, folw. (АВАК, XVIII, 469, 470, 1669, Берест. в.); *Jackowiczy* (АВАК, VI, 94, 1639, Берест. в.); *Bazielewska sloboda / Bazieli*, wieś (ИЮМ, XXVI, 273, 1669, Witt. w.) / *Базилевская слободка / Basielewskaja slobodka / Bazielowa,* wieś / *Bazielow,* wieś (ИЮМ, XXVIII, 61, 63, 1704, Czeczersk. star.); *Halaszowo,* d. (ИЮМ, XXIX, 357, 1772, Wieliż. wł., Chrestowsk. woyt., Wit. w.)*; Koralewszczyzna,* d. (ИЮМ, XXIX, 334, 1772, Wieliz. wł., Wit. w.). Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што каталіцкая царква ў той час была адным з найбольш буйных землеўласнікаў на беларускай тэрыторыі.

З'яўленню новых назваў садзейнічалі таксама сацыяльна-эканамічныя рэформы, некаторыя з іх пачаліся яшчэ напярэдадні ўзнікнення федэратыўнай дзяржавы. Так, з мэтай павелічэння даходаў з дзяржаўных зямель вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст ажыццявіў у дзяржаўных маёнтках рэформу, якая атрымала назву „валочная памера". На падставе асноўнага дакумента рэформы – *Уставы на валокі* (1 красавіка 1557 г.) – была праведзена суцэльная рэвізія дзяржаўных і вялікакняжаскіх уладанняў: удакладнены ўлік зямель, абкладанне сялян павіннасцямі прапарцыянальна занятай зямлі, вылучэнне адзінай пазямельнай меры – валокі (плошча ў 30 маргоў або 9000 прутоў, 21,36 га), вызначэнне пэўных павіннасцей за карыстанне зямлёй. Падчас рэформы ўся зямля ў маёнтках дзялілася на валокі, лепшыя з якіх адводзіліся пад вялікакняжацкія гаспадаркі – фальваркі. Пасля правядзення валочнай памеры, арыентаванай на змяншэнне ўплыву абшчыны і большую індывідуалізацыю сялянскага землеўладання, рэзка ўзрасла колькасць сялянскіх пасяленняў. Згодна з *Уставай*, кожная сялянская сям'я павінна была асядаць на асобным надзеле, што вяло да заснавання новых невялікіх па памерах паселішчаў, у аснове назваў якіх звычайна было імя галавы сям'і[8].

Тэмпы рэформы на розных землях Беларусі былі розныя. У цэнтры і на захадзе, дзе памешчыцкія гаспадаркі былі цесна звязаны з рынкам і карысталіся правам

[7] I. L. Kapyłou, *Pryrodna-hieahraficznaja leksika u ajkanimii biełaruskich dzieławych pomnikau XV–XVIII stst*, [u:] *Biełaruskaja mowa i mowaznawstwa na rubiaży III tysiaczahoddzia*: Materyjały nawyk. kanf., pryswiecz. 70-hoddziu In-ta mowaznawstwa imia Jakuba Kołasa NAN Biełarusi, 2–3 list. 1999 h., In-t mowaznaustwa NAN Biełarusi, Bieł. resp. fond fundamient. dasledawanniau, Minsk 2000, s. 78–81.

[8] *Encyklapiedyja historyi Biełarusi*, t. 2, 1994, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja, s. 213.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



бяспошліннага гандлю, рэформа была завершана да канца XVI ст. На паўночным усходзе, дзе ішла Лівонская вайна (1558–1583 гг.) і землі спусташаліся войскамі Івана Грознага, а таксама на ўсходзе, дзе Вялікае Княства межавала з Маскоўскай дзяржавай, фальваркавая сістэма не стала пераважнай і рэформа зацягнулася больш чым на сто гадоў, валочны надзел зацвердзіўся толькі к сярэдзіне XVII ст. Адпаведна па-рознаму праходзіла і тапанімізацыя тэрміна *валока.* Айконімы, у аснову якіх быў пакладзены тэрмін *валока*, засведчаны галоўным чынам на тэрыторыі цэнтральных, заходніх і паўднёва-ўсходніх беларускіх зямель Рэчы Паспалітай. Так, на Генеральнай карце *Беларускія землі ў канцы XVIII ст.* значыцца некалькі вёсак з назвай *Валокі* (уладанне Слізеняў маёнтак Мсціж, Менскі павет; касцёльнае ўладанне ў межах Радашковічаў; шляхецкае ўладанне на тэрыторыі Навагродскага павета; маёнтак Таўкачэвічы Менскага павета; маёнтак Хвойнікі, на той час тэрыторыя Каралеўства Польскага)[9]. На тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі ў пачатку XVIII ст. зафіксавана толькі адно найменне *Wloki,* wieś */ Woloki,* wieś (ИЮМ, XXIII, 47, 50, 1716, Wit. w.) у Віцебскім ваяводстве, што абумоўлена адсутнасцю доўгі час фальваркава-паншчыннай гаспадаркі ў гэтым рэгіёне.

Пры правядзенні рэформы не было рэгламентацыі або абмежаванняў у надзяленні сялян зямлёй. Сялянская гаспадарка магла ўзяць валоку або яе частку. З’явіліся пустыя валокі, якія стварылі рэзервовы зямельны фонд. На працягу другой палавіны XVI – першай палавіны XVII ст. у выніку рэформы памеры многіх сялянскіх надзелаў значна зменшыліся. Не кожная сям’я была ў стане апрацоўваць цэлую валоку зямлі і плаціць адпаведныя падаткі. Даволі часта валоку дзялілі на часткі паміж сабой невялікія сем’і [39, 51]. Адна чацвертая частка валокі, якую апрацоўвала адна сям’я называлася *чацвярнёй*, адна пятая – *пяцярнёй.* Гэта сацыяльна-эканамічная асаблівасць абумоваіла ўзнікненне тапонімаў *Czecwernia,* d. (ИЮМ, XXIX, 333, 1772, Wieliż. wł., Siercieyck. woyt., Wit.w.)*, Пятерня,* ур. (ИЮМ, XXXI, 323, 1765, Вит. в.).

Актыўнае ўжыванне апелятыва *фальварак* у значэннях ‘комплекс зямельных уладанняў, на якіх памешчык вёў уласную гаспадарку’, ‘маёнтак феадала’ў перыяд Рэчы Паспалітай стрымлівала працэс яго анімізацыі. Таму ў дзелавых помніках і картаграфічных матэрыялах даследаванага перыяду зафіксавана толькі адна назва вёскі *Фальварак* на тэрыторыі Віцебскага павета.

Другая палова XVII – першая палова XVIII стст. у гісторыі Беларусі характарызуецца як перыяд глыбокага эканамічнага заняпаду, прычынамі якога былі шматлікія вынішчальныя войны: антыфеадальная 1648–1654 гг., вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., польска-шведская 1655–1660 гг., Паўночная вайна 1700–1721 гг. Іх вынікам стала поўнае разбурэнне гарадоў і сельскай гаспадаркі, асабліва ва ўсходніх і паўночных раёнах, і рэзкае скарачэнне насельніцтва (параўн., у 1654 годзе на беларускіх землях жыло каля 2,9 млн чалавек,

9 *Wialiki histaryczny atłas Biełarusi u 4 tamach*, t. 2, Minsk: „Biełkartahrafija”, 2013, s. 82, 90, 99, 122.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



у 1667 засталося каля 1,4 млн чалавек). Спусташальныя войны прывялі да разбурэння эканомікі і заняпаду сельскай гаспадаркі. Наступствамі войнаў стала абязлюджванне ўсходніх і паўночных паветаў Беларусі. Адсутнасць земляробаў прывяла да змягшэння амаль напалову колькасці ворыўных зямель і цяглавай жывёлы. У сувязі з такой сітуацыяй феадалы часова ішлі на ўступкі сялянам, асабліва ва ўсходніх раёнах. У першай палавіне XVIII стагоддзя феадалы праводзілі аднаўленчую палітыку за кошт росту сялянскіх гаспадарак. Пры гэтым сялянам-новапасяленцам даваліся льготы ў павіннасцях[10]. У выніку сялянскай каланізацыі ўзнікла шматлікая колькасць новапасяленняў, што атрымлівалі імёны першараспрацоўшчыкаў зямель або першапасяленцаў. У дзелавых дакументах захаваліся запісы, якія прама ўказваюць на матывацыю такіх назваў: */дарога/ … проведена была тамъ, гдѣ поселился крестьянинъ Бернак, или гдѣ нынѣ лежитъ деревни, называемая Бернаково* … (ИЮМ, IV, 294, 1777, Велиж. у.); */ разграниченіе/ … отъ Каушуриной Нивы, названной такъ по имени крестьянина Каушуры, который её обработалъ* ... (ИЮМ, IV, 294, 1777, Велиж).

З перыядам часовага вызвалення новапасяленцаў ад павіннасцей і падаткаў звязана шырокае адлюстраванне ў першакрыніцах тапонімаў, матываваных словам *слобода* і яго вытворнымі *слободка*, *слободок*: *Слобода* (7 н.п.); *Слобода* (ИЮМ, XXX, 114, 1577, Мог.); *Слобода,* д. (ИЮМ, XXII, 418, 1764, Улла)*, Слобода*, им. (ИЮМ, XXV, 378, 388, 1670, Пол. в.), *Слобода*, месът. (ИЮМ, XXII, 287, 1620, Пол. в.), *Слобода*, с. (АВАК, XIII, 362, 164., Гом. стар.), *Слобода*, с. (ИЮМ, XXV, 426, 1649, Орш. пов.), *Słoboda / Słoboda Szczytowska*, maietn. (ИЮМ, XXV, 388, 1670, Poł. w.), *Słoboda, alias Holynia*, wieś (ИЮМ, XXII, 418, 428, 1764, Poł. w.), *Слобода Витебская* (ИЮМ, XXI, 287, 1620, Вит. в.), *Слобода Дисненская* (ИЮМ, XXIX, 53, 1772, Пол. в.), *Słoboda ku Dworowi* (ИЮМ, XXII, 421, 1764, Uła), *Слобода Куровичовская за рекою Вехрою*, им. (ИЮМ, XXV, 495, 1659, Мстисл. в.), *Słoboda Nacza*, miast. (АВАК, XXXIII, 274, 1633, Czaszn.), *Słoboda Prudzienska*, siołko (ИЮМ, XXVIII, 172, 1614, Orsz. pow.), *Слободка* (ИЮМ, IX, 31, 1692, Мог.) / *Słobodka* (ИЮМ, X, 460, 1692; XII, 92, 1697, Moh.), *Слободка* (ИЮМ, XXV, 8, 1714, Мог.), *Слободка*, гр. (ИЮМ, XXIII, 373, 1623, Пол. пов.), *Слободка*, заст. (ИЮМ, XXV, 74, 1719, Вит. в.)*, Słobodka*, maietn. (ИЮМ, XXV, 371, 1668, Wit. w.) */ Слободка*, им. (ИЮМ, XXV, 88, 1719, Вит. в.)*, Слободка*, поле (ИЮМ, XXI, 153, 1713, Вит. в.)*, Слободка Борисоглѣбская* (ИЮМ, XXII, 299, 1624, Пол. в.)*, Слободка Владычняя / Слободка Владыцкая* (ИЮМ, XXVI, 419, 1721, Вит. в.)*, Słobodka na Zaruczewiu*, maietn. */ Slobodka*, maietn. (ИЮМ, XXV, 117, 179, Wit. w.)*, Слободка Пискунова* (ИЮМ, XVIII, 141, 1710, Мог.) */ Пискунова слободка* (ИЮМ, XIX, 79, 1715, Мог.)*, Слободка Подмонастырская*, им. */ Słobotka*, im. */ Słobodka,* im. (ИЮМ, XXIII, 37, 43, 1690–1716, Вит. в.), *Слободка Чернецов*, с. (ИЮМ, XX, 251, 1712, Вит. в.), *Слободки*, ым. (ИЮМ, XXV, 492, ?, Мстисл. в.), Słobodki*, albo Ryzakino*,

10 W. I. Mieleszko, *Oczerki agrarnoj istorii Wostocznoj Biełorusii* (wtoraja połowina XVII–XVIII ww.), Minsk: „Nauka i tiechnika”, 1975, s. 22.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



zasc. (ИЮМ, XXV, 74, 1719, Wit. w.), *Слободки-Большія* (ИЮМ, XXIV, 467, 1664, Мстисл. в.)*, Слободки-Малие* (ИЮМ, XXIV, 467, 1664, Мстисл. в.), *Слободок*, им. (ИЮМ, XXV, 491, 1662, Мстисл. в.), *Слободскій посад* (ИЮМ, XXV, 346, 1635–1637, Вит. в.), *Слободское село* (ИЮМ, XXV, 426, 1649, Орш. пов.), *Слободское село* (ИЮМ, XXV, 426, 1649, Орш. пов.).

На ўсходніх землях у перыяд другой палавіны XVII – першай палавіны XVIII стст. асабліва шырока практыкавалася асада земляробаў „на слободе”. Для больш хуткага ўключэння пусташаў у гаспадарчы зварот сялянам даваліся часовыя льготы ад падаткаў на некалькі гадоў. Паселішчы, што ўзнікалі на льготных землях, называліся *свабодамі* або *волямі*. Новапасяленцы, што асядалі на слабодах, як правіла, засноўвалі льготныя паселішчы – *слабоды*: напр., *„Іанку, который на слободе мешкает бороню и моцъ … боронити буду, кгдыжъ дей тую слободу и рудьницу побудовалом на кгрунъте моемъ…”* (ИЮМ, XXII, 188, 1620). На тапанімізацыю апелятыва *слобода* ў значнай ступені ўплываў той фактар, што пасля сканчэння льготнага тэрміну, насельнікі слабод вымушаны былі выконваць усе ўскладзеныя на іх ў агульным парадку павіннасці. Адпаведна страчваўся і першапачатковы сэнс слова *слабада*, што з цягам часу садзейнічала пераходу лексемы *слобода* са сферы агульнай лексікі ў катэгорыю ўласных імён.

Да слабады, як тыпу пасялення, згодна з паказаннямі помнікаў, прыраўноўвалася *воля*. Аднак арэал распаўсюджання апелятыва *воля* і вытворных ад яго тапонімаў на старажытных тэрыторыях у асноўным прыпадае на землі Віленшчыны, Гродзеншчыны і Міншчыны [104, 118]: *Wolka,* село (АВАК, XVIII, 419, 1661, Пинск. пов.), *Волка,* село (АВАК, IV, 51, 1619, Берестейское воев., относ. къ им. Коренево) //*Wołka,* wieś (АВАК, IV, 62, 1699, Берест. в., относ. къ им. Коренево), *Wolka,* [им.] (АВАК, IV, 521, 1735), *Wolka,* maiętn. (АВАК, V, 89, 90, 91, 1720, Берест. в.), *Волка Багрынка,* село (АВАК, XVIII, 351, 1646, Пинск. пов.), *Wolka Kupiatyckaja,* /*Wolka,* (АВАК, XVIII, 418, 1661, Пинск. пов.) / *Wolka Radowiskaja,* [с.] (АВАК, XVIII, 409, 1660, Пинск. пов.), *Wolka Czerniakowa,* [село] (АВАК, XIV, 591, 1597, Кобр. Стар. и пов.), *Wolke Pniewiensko,* s. / *Wolka Pniewienska,* [s.] (АВАК, 28, 303, 307, 1646; Пинск. Пов., относ. к маент. Любешово), *Volya Choienska,* [им., с.] (АВАК, XIX, 72, 1539) *Wolia Choienska,* [им., с.] (АВАК, XIX, 221, 1579), *Volya Lyesczanska,* [им.] (АВАК, XIX, 40, 1531) /*Volia Liesczaniska,* villa (АВАК, XIX, 119, 1560), *Volya Verescynska,* [им.] (АВАК, XIX, 23, 1511, Холмск. зем.) // *Volya Veresczinska,* [им.] (АВАК, XIX, 72, 1539, Холмск. зем.?), *Wolki,* wioska (АВАК, VI, 100, 1625, Пинскій пов.?). У гістарычных дакументах, якія датычаць паўночна-ўсходняй Беларусі, сустрэўся толькі адзін айконім з гэтай асновай: *Воля*, им. (ИЮМ, XXVI, 473, 1667, Пол. в.).

Уласныя геаграфічныя назвы з’яўляюцца гістарычнымі помнікамі, у якіх адлюстраваліся не толькі сацыяльныя і эканамічныя адносіны, але і моўная сітуацыя адпаведнай эпохі. З другой паловы XVI стагоддзя старабеларуская тапанімічная сістэма паступова ўбірае ў сябе рысы польскай мовы. Асабліва гэта стала прыкметным к канцу XVII стагоддзя, калі польская мова пачала выцясняць беларускую са справаводства (дакументы запісваліся на польскай і старабеларускай мовах або

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



толькі на польскай мове), калі ўсё шырэй распаўсюджвалася польская і лацінская пісьменнасць, арыентаваная не толькі на палякаў, але і беларусаў як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання. Помнікі дзелавой пісьменнасці і картаграфічныя матэрыялы дазваляюць прасачыць стан старабеларускай тапаніміі ў польскамоўных тэкстах на розных моўных узроўнях і прааналізаваць працэсы адаптацыі.

## Графічныя і фанетыка-арфаграфічныя асаблівасці

У старапольскіх тэкстах назіраецца шырокая графічная і фанетыка-арфаграфічная варыянтнасць некаторых літар і гукаў пры іх пісьмовай перадачы ў складзе тапонімаў. Лінгвістычны аналіз тапаніміі канцылярска-юрыдычных помнікаў паказаў, што пачынаючы з другой палавіны XVI ст. уласныя геаграфічныя назвы паступова адлюстроўваюць тыповыя рысы польскай фанетыкі і арфаграфіі. Разам з тым на фоне суцэльнай паланізацыі агульнай лексікі тапонімы захоўваюць некаторыя фанетычныя асаблівасці мясцовых беларускіх гаворак, што і спарадзіла варыянтнасць. З'ява варыянтнасці зычных і галосных у значнай ступені праявілася і ў польскамоўных тэкстах.

Па-рознаму лацінскай графікай перадаваліся літары *я, е* ў абсалютным пачатку і ў сярэдзіне слова: *Jałowaste,* urocz., grunt / *Iałowaste,* urocz., grunt (АВАК, XII, 31, 32, 35, 1751/52, Слоним. пов.), *Jurjewo,* [im.?] / *Juriewo,* [im.?] (АВАК, XXXVII, 450, 451, 1812, Борис. пов.?). Не было паслядоўнасці пры перадачы на пісьме насавых гукаў: *Bądarowskie,* półwłocze / *Bondarowskie,* półwłocze (АВАК, XXXVIII, 367, 368, Рѣч. пов.?), *Jastrzębie,* [им.] (АВАК, VIII, 345, 1698, Берест. в.) // *Jastrzębie,* folw. / *Jastrzembie,* [им.] (АВАК, VIII, 219, 220, 1784, Берест. в.). У польскамоўных помніках не назіраецца аднастайнасці пры пісьмовай перадачы [*р*]. У крыніцах XVI стагоддзя звычайна гэты гук перадаецца літарай *r*, у пазнейшых выданнях XVII ст. – дыграфам *rz*: *Andreiewo,* miesteczko (АВАК, XXXIII, 100, 1584, Берест. в.) / *Andrzejow,* им. (АВАК, XXVII, 5, 1695); *Задвораны,* село (АВАК, XVIII, 325, 326, 1631, Берест. в.?) // *Zadworzany*, sioło (АВАК, XVIII, 387, 388, 1652, Слоним.? /Волков.? пов.). Няма паслядоўнасці і пры перадачы гука [г]. Пры гэтым у адных і тых жа дакументах сустракаецца па некалькі пісьмовых варыянтаў: *Glinianka,* wieś (АВАК, IV, 263, 1698, Глинянское войт.) – *Hlinianki,* s. (АВАК, XIV, 577, 1597, Кобр. Стар. и пов.) – *Глинное,* село (АВАК, XVIII, 365, 1648, Пинск. пов.) – *Hlinnaja,* sioło (АВАК, XVIII, 405, 406, 1660, Пинск. пов.); *Hwozna,* r., rzcz. / *Chwozna,* r. (АВАК, XIV, 70–73; 1560); *Городня*, м. (АВАК, 28, 129, 1630) // *Городенское,* место (АВАК, XVIII, 51, 1582) // *Horodnia,* m. (АВАК, 28, 195, 1645) // *Grodna,* [m.] (АВАК, 14, 395; 1591).

Пісьмовыя крыніцы дазваляюць прасачыць замену ўсходнеславянскіх поўнагалосных спалучэнняў *-оро, -оло* няпоўнагалоснымі *-ро, -ло*. Як вынік узніклі паланізаваныя назвы тыпу: *Блонь* (ИЮМ, XXIII, 331, 1623, Пол. в.), *Кгродекъ-Соломерецкій* (АВАК, XV, 332, 1673, Мстисл. в.), *Навлоки,* д. (ИЮМ, XXVI, 490,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



1667, Пол. в.) / *Навлока* (ИЮМ, II, 288, 1692, Пол. в.). Разам з тым паралельна працягваюць ужывацца ў пісьмовых дакументах і поўнагалосныя формы: *Оболонье,* д. / *Obolonie,* wieś (ИЮМ, XXII, 418, 438, 441, 1764, Ула)*, Городок Соломерецкій* (АВАК, XV, 332, 1673, Мстисл. в.). Часта ў актавых запісах сінхронна рэгіструюцца абодва варыянты: поўнагалосны старабеларускі і няпоўнагалосны, абумоўлены уплывам польскай мовы: *Им. Гродно и проч. 1641 г. Октяб. I въ Витебскъ сост., а 7 явл. купчая, по коей Витеб. воев. земянинъ Иванъ Богдановичъ Старосельскій продалъ сыну своему ... часть свою въ им. Городно, въ Витеб. воев. леж.* (ИЮМ, XXVI, 429, 1641, Вит. в.). Паказальна, што некаторыя поўнагалосныя формы працягваюць устоўліва захоўвацца нават у помніках XVIII стагоддзя, напісаных на польскай мове. Прыкладам гэтага служыць скарга віцебскага падсудка на полацкага ўніяцкага архіепіскапа, у якой у польскамоўным тэксце побач суіснуюць абодва варыянты айконіма *Woloki* – *Wloki*: *… naiachawszy, tenże jm pan Karol Hrebnicki z niemalo gromado ludzi, w same pierwospy, z orenżem, do boiu należącym, na wieś zaldelatorow, nazwano Włoki, wdztwie Witt. leżącą ...* (ИЮМ, XXIII, 47, 1716, Poł. w.) – *... przez obżałowanych niepoiednokrotnie poczynione, nocnym sposobem, w maietnosci dziedziczney Starego Sioła, ze wsi Wołok, wieczystych poddanych …* (ИЮМ, XXIII, 50, 1716, Poł. w.). З сярэдзіны XVI да сярэдзіны XVII ст. фанетыка-арфаграфічная варыянтнасць поўнагалосных і няпоўнагалосных спалучэнняў у тапаніміі набывае рэгулярны характар: *Berezow Kut,* wieś (АВАК, III, 100, 1681, Берест. в.?) // *Brzezow Kut,* wieś (АВАК, III, 192, 1746, Берест. в.?); *Beressczie,* [м.] (АВАК, XIX, 138, 1568) // *Brzessczie,* [м.] (АВАК, XIX, 140, 1569) // *Brzessczie,* [м.] (АВАК, XIX, 198, 1577) // *Brzeszczie,* [м.] / *Brzesczie,* miasto (АВАК, XIX, 245, 247, 249, 1580) // *Brzesczie,* [м.] (АВАК, XIX, 323, 1591) // *Brzisczie,* [м.] (АВАК, XIX, 330, 1593) // *Brzescie,* [м.] (АВАК, XIX, 366, 357, 1595) // *Brzesczye Lithwanico,* [м.] (АВАК, XIX, 97, 1544); *Заболотье,* село (АВАК, VI, 61, 62, 1589, Берест. пов.) // *Zabłocie,* im. (АВАК, XVIII, 301, 1629, Берест. воев.); *Kożangrodka,* maięt. / *Kożangrodok,* [maięt.] (АВАК, 28, 219, 220, 1646; Новогр. в.) / *Кожангородок,* им. (АВАК, 28, 252, 253, 256, 1646; Новогр. в.; *з загал. дак-та*) / *Kożangorodeckie,* m. / *Koźangorodeckie,* m. / *Kożangrodek,* maięt. / *Kożangrodek,* m. (АВАК, 28, 252–254, 1646; Новогр. в.) / *Kożangrodek,* m.) / *Kozangrodek,* miast. (АВАК, 28, 378–380, 1660; Новогр. в.) / *Кожангородок,* им. (АВАК, 28, 379, 1660; Новогр. в.).

Нерэгулярна перадаецца ў тапонімах на пісьме гук [у] – о, ó (крэскаванае): *Zabłudow,* m. / *Zabłudowskie,* im. / *Заблудовъ,* м. (АВАК, VII, 20, 21, 22, 150, 151, 1707, Городенск. пов.) // *Zabłudow,* [m.] (АВАК, VII, 42, 43, 1743, Городенск. пов.) // *Zabłudowskie,* im. / *Zabłudow,* [m.] / *Zabłudów,* [m.] / *Zabłudowszczyzna,* [m.] (АВАК, VII, 204, 1714, Городенск. пов.); *Zdzięciółka,* rzeka / *Zdzięciołka,* rzeka (АВАК, XXXV, 463, 464, 480, 1785, Новогор. в., Слоним. пов.).

Зусім нязначная колькасць прыкладаў дзекання сустракаецца ў тапонімах XVII стагоддзя: *Гарадзищо* (ИЮМ, XXV, 212, 1670, Пол. в.)*, Дзенюны, с.* (АВАК, IX, 30, 1638, Березвецк. монаст.), *Дзисенское место* (ИЮМ, XXVI, 494, 1671, Пол. в.). Але і гэтыя адзінкавыя прыклады дзекання нельга адназначна інтэрпрэта-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



ваць, як адлюстраванне спецыфічнага беларускага гукатыпу, паколькі пярэднеязычная афрыката была характэрна і для польскай мовы. А таму не выключана, што некаторыя напісанні адлюстраваліся па ўзоры польскай графікі. Сведчаннем таму служаць тэксты, напісаныя на старабеларускай і польскай мовах, дзе знаходзім формы тыпу: *Диковичи,* дворъ (АВАК, XVIII, 8, 1561, Пинск. пов.) // *Dzikowiczy,* wieś (АВАК, XVIII, 517, 518, 1707, Пинск. пов.).

У канцы XVI – першай палове XVII стст. назіраецца шырокае вар'іраванне напісанняў назвы горада Мінска: *Менскъ,* [гор.] (АВАК, II, 293, 294; 1595) // *Менскъ,* [гор.] (АВАК, XXVIII, 101, 103, 1606) / *Минскъ,* [гор.] / *Минское,* м. / *Minskie,* m. / *Minsk,* [gor.] / *Менъское,* м. (АВАК, XXVIII, 139, 140, 156, 163, 1635) / *Minsk,* [gor.] / *Минское,* м. / *Minskie,* m. / *Минъскъ,* [гор.] / *Минскъ,* [гор.] (АВАК, XXVIII, 167, 169, 171, 173, 174, 1638) / *Менскъ,* м. (АВАК, XXVIII, 72, 1605) / *Minsk,* [gor.] (АВАК, XXVIII, 283, 1646) / *Минъскъ,* [гор.] / *Минскъ,* [гор.] (АВАК, XXVIII, 353, 1654) / *Минскъ,* [гор.] / *Минъскъ,* [гор.] (АВАК, XXVIII, 404, 405, 1666) // *Меньскъ,* [м.] / *Менскъ,* [м.] / *Меньское,* место (АВАК, XVIII, 40, 41, 43, 1582) // *Минскъ,* местце /*Меньскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 96, 107, 1592) // *Менское,* место /*Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 135, 136, 1596) // *Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 139, 140, 152, 1597) //*Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 158, 1598) //*Менское,* место / *Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 167, 169, 1599) //*Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 171, 1600) //*Менскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 184, 187, 1602) //*Менскъ,* [м.] /*Менъскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 204, 205, 207, 218, 219, 1607) //*Меньскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 236, 1615) //*Менскъ,* [м.] /*Минскъ,* [м.] (АВАК, XVIII, 320, 322, 1631) // *Minsk,* [м.] (АВАК, XVIII, 380, 1649) // *Mińsk,* [гор.] (АВАК, VI, 121, 123, 124, 1625) // *Минскъ,* [г.?] (АВАК, XIV, 2, 3; 1501, Минское воев., Минскій пов.) // *Минскъ,* [гор.] (АВАК, XIV, 358; 1590, Минское воев., Минскій повѣтъ) // *Минскъ,* гор. /*Менскъ,* [г.] (АВАК, XIV, 367, 372, 373, 1590) //*Менскъ,* [гор.] /*Mińsk,* [гор.] (АВАК, XIV, 497, 505, 1594). Я. Ф. Карскі фанетычную мену *е* на *і* ў старажытнай назве *Мѣнѣскъ* у *Мінск* тлумачыць украінскім уплывам.[11] Сапраўды, украінізмы былі нярэдкай з'явай у старабеларускай пісьменнасці. Але ўкраінскае ўздзеянне было найбольш моцным на беларускія паўднёва-заходнія гаворкі. Нам уяўляецца, што ў адносінах да цэнтральных зямель Беларусі падобны фанетычны пераход хутчэй за ўсё трэба звязваць з уплывам польскай мовы. Да таго ж з'яўленне напісанняў з *и* на месцы *е* адносіцца да першай паловы XVII ст. – перыяду інтэнсіўнага пранікнення польскай мовы ў дзелавую пісьменнасць.

Уплывам польскай мовы абумоўлена і варыянтнасць *л / дл:* назвы *Шиловец* / *Шидловецъ,* [им.] (АВАК, VI, 39, 220, 1589–1602) // *Szydłowec,* [im.-?] (АВАК, II, 84, 86, 102; 1696–1789).

11 J. F. Karskij, *Trudy po biełorusskomu i drugim sławianskich jazykam*, Moskwa: Izd-wo Akad. nauk SSSR, 1962, s. 483.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



## Структурна-граматычныя асаблівасці. Евфимий Фёдорович

Паводле структурнага афармлення беларускі тапанімікон перыяду Рэчы Паспалітай уяўляе сабой даволі разнародны комплекс. Асноўную частку яго складаюць назвы геаграфічных аб'ектаў, утвораныя пры дапамозе традыцыйных старажытных тапафармантаў *-ов* (*-ев*), *-ово* (*-ево*), *-ова* (*-ева*), *-ин* (*-ын*), *-ино* (*-ыно*), *-ина* (*-ына*), *-овка* (*-евка*), *-инка* (*-ынка*), *-ец, -ица* (*-ыца*), *-щина* (*-щизна*). Колькасна тапонімы з суфіксамі *-ов, -ин* знаходзяцца па-за канкурэнцыяй сярод тапапнімічных дэрыватаў з іншымі фармантамі. На станаўленне тапанімічных фармантаў *-ов, -ин…* уплывалі фактары лінгвістычнага і экстралінгвістычнага характару. Фарміраванне прыналежных форм тапонімаў было непасрэдна звязана з развіццём феадальных адносін і прыватнай уласнасці на зямлю. Перыяд найвышэйшага росквіту тапонімаў з прыналежным значэннем прыпадае на час пасля правядзення валочнай рэформы, якая прывяла да ўзнікнення вялікай колькасці дробных землеўладальнікаў. Масавасць і частая паўтаральнасць прыналежных суфіксаў садзейнічала спецыялізацыі іх як тапанімічных сродкаў. У значнай ступені замацаванню прыналежных форм у тапаніміі спрыяла і далучэнне адзначаных суфіксаў да антрапанімічнай асновы, што дазваляла індывідуалізаваць геаграфічныя аб'екты. У гістарычных дакументах XVI–XVIII стст. назіраецца найбольш частае спалучэнне айконімаў і мікратапонімаў з тэрмінам имение (именье), цесна звязаным з феадальнай сістэмай землеўладання: *Горниково именье*; *Марково именье*; *Стукачево имение*; *Яцково именье* і інш. Некаторыя тапонімы на *-ово* (*-ево*) з'яўляліся таксама назвамі *местечек, мест, урочищ, селец*: *Луполово место*; *Суково мѣстечко; Antuszowo uroczyszcze; Zaciewo uroczyszcze; Немтиново сельцо* і інш. Многія населеныя пункты і зямельныя надзелы таксама абазначаліся тэрмінамі *деревня, весь, слобода, слободка, служба, пустошь*, што і абумовіла ўзнікненне айконімаў у афармленні суфіксаў *-ова* (*-owa*), *-ева (-iewa*), *-ина* (*-ina*)*; -ына* (*-yna*): *Баганова деревня*; *Жернобоева деревня*; *Шлюпина деревня*; *Марьина деревня*; *Kakowczyna wieś*; *Klimowa słoboda*; *Жеребцова слободка*; *Ерылова служба*; *Васькова пустошь; Москалева пустошь*; *Цыбульчина пустошь* і інш. Між іншым, важную ролю ў фарміраванні айконімаў з гэтымі суфіксамі адыграла катэгорыя дапасаваных генетываў, тыповая для тапаніміі XV–XVII стст.: напр., *селце Василя Полуева; пустошь Пришивальнева села Кушликов; Юрька Гуторова фольварк; Михалки Капилова деревня* і інш. Значна радзей адзначаюцца айконімы з прыналежным кампанентам *-ов* (*-ow*); *-ев* (*-iew*); *-ин* (*-in*); *-ын* (*-yn*), якія выступаюць у спалучэнні з такімі назвамі тыпаў пасялення, як *застенок, фольварок, двор*, *посад*: *Козинъ застенок*; *Степановъ фольварк*; *Комаров двор*; *Кузевкин двор*; *Кривъцовъ посад* і інш. Ва ўсіх пералічаных вышэй выпадках прыналежныя прыметнікі, выступаючы ў ролі мясцовых назваў, з'яўляюцца ў словазлучэннях атрыбутыўнымі членамі. Пры гэтым яны паясняюць, каму належыць пэўны тып паселішча або зямельны надзел. У далейшым з-за аднароднасці і частаты ўжывання наменклатурнага тэрміна,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



як заўважыла В. П. Лемцюгова, адбывалася страта яго айканімічнай нагрузкі[12]. У некаторых актах позняга паходжання наменклатурны тэрмін мог наогул не ўпамінацца пры айконімах. Так, у большасці запісаў прыходна-расходнай кнігі горада Магілёва, якая датуецца першымі дзесяцігоддзямі XVIII стагоддзя, амаль заўсёды адсутнічаюць указанні на тып паселішча. Напрыклад, у рэестры прыходаў і расходаў за 1714 год запісана: [*расходы войта*] *... 1 Декабря въ Шамовѣ пиво 20 гр. …* (ИЮМ, XXV, 31, 1714, Мог.); *… въ Головчинѣ водка выпитая съ … и другими людьми послѣ службы Божіей, I зол. 10 гр.* (ИЮМ, XXV, 23, 1714, Мог.). Такім чынам, пачынаючы з XV стагоддзя і да канца XVIII стагоддзя ў старабеларускіх пісьмовых крыніцах назіраецца працэс субстантывацыі прыналежных прыметнікаў на *-ов, ин*... З утварэннем эліпсаў прыналежныя суфіксы пачалі выконваць чыста фармальную функцыю тапанімічных фармантаў.

Адным з асноўных вынікаў субстантывацыі можна лічыць з’яўленне вялікай колькасці айконімаў з пасесіўнымі фармантамі без фармальных прыкмет дапасавання. Пры гэтым айконімы, якія з’яўляліся назвамі *имений, сёл, мест*, маглі мець форму прыметнікаў мужчынскага або жаночага роду: *Савинъ*, им.; *Ходосовъ*, им.; *Мохировъ*, с.; *Czerekow*, m.; *Быкова*, им. і інш. І наадварот, такія тыпы паселішчаў, як *селиба, весь, деревня, слобода, маентность (маетность), усадьба* звязваліся з айконімамі ніякага роду: *Безушково*, селиба; *Bieleniewo*, wieś; *Пугачево*, д.; *Лупалово*, слободк.; *Kobylino*, d.; *Акъсенътеево*, д.; *Karpino*, wieś; *Брухово*, маетн.; *Наконово*, усадьб. і інш. Айконімы, якія выражалі прыналежнасць да геаграфічных аб’ектаў мужчынскага роду, маглі мець суфіксы ніякага роду: *Biernowo*, f.; *Bublewo*, f.; *Казимирово*, ф.; *Доманово*, дв.; *Żołudowo*, zasc.; *Kowalewo*, dw. і інш.

Даволі часта фіксуюцца двайныя формы адной і той жа геаграфічнай назвы: з *-ов* (*-ow) / -ово*: *Bohdanow*, im. / *Богданово*, им.; *Paszkow*, im. / *Пашково*, им.; *-ев* (*-iew*) */ -ево*: *Бѣлевъ*, им. / *Билево*, им.; *Polciew*, maietn. / *Полтево*, им.; *-ин* (*-in*) */ -ино*: *Ryndzin*, dobr. / *Рындино*, им.; *Ciwin*, dobr. / *Цивино*, им. і інш. Аналіз старажытнага ўласнатапанімічнага і гістарычнага матэрыялу дазваляе вызначыць прычыны ўзнікнення варыянтных фармантаў айконімаў. Найбольш тыповыя з іх:

1. У залежнасці ад сацыяльна-эканамічных адносін адбываліся частыя змены тыпаў паселішчаў. Так, у першай палавіне XVI ст. у многіх дзяржаўных уладаннях, прыватных і царкоўных маёнтках існавалі двары, якія ў канцы XVI ст., у парэформенны час станавіліся фальваркамі. Здаралася, што сяло станавілася вёскай, вёска – пусташшу, і наадварот, на месцы пусташы ўзнікала новае паселішча. Напрыклад, *Малахово* ў гісторыка-юрыдычных дакументах 1626 года ўпамінаецца як *село Малахово*, а згодна з паказаннямі інвентара Веліжскага павета 1772 года яно становіцца *деревней Małachowo*. *Мошкова* (*Мошкава*) у справах Полацкага гродзкага суда 1532 года рэгіструецца як *двор*, а, паводле гісторыка-юрыдычных матэрыялаў канца XVI ст., двор становіцца фальваркам *Мошково.*

[12] W. P. Lemciuhowa, *Biełaruskaja ajkanimija*, Minsk: „Nawuka i technika”, 1970, s. 113.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



Даволі часта назвы маёнткаў пераходзілі на назвы вёсак, назвы сёл – на назвы службаў, якія да іх належалі або былі паблізу да іх размешчаны: напр., *служба Микулино* (*есть также невдалеке оттуда с. Микулино…*) (ИЮМ, XXII, 319, 1642, Пол. в.).

2. Многія айконімы пераафармляліся па найбольш распаўсюджанай мадэлі, якой на той час была мадэль на *-ово, -ино…* У выніку ўзнікалі групы назваў тыпу: *Брухово*, с.; *Брухово*, маетн.; *Брухово*, д.

3. У сувязі са з'яўленнем прозвішчаў з прыналежнымі суфіксамі ў канцы XVII ст. ўзнікалі аманімічныя формы айконімаў і антрапонімаў. Таму адной з прычын, што выклікалі нейтралізацыю тапанімічных фармантаў *-ов* (*-ев, -ёв*), *-ин (-ын), -ова* (*-ава, -ева*), *-ина* (*-ына*), *-ово* (*-ево, -ёво*), *-ино* (*-ыно*) паслужыла пагроза аманіміі прозвішчаў і назваў населеных пунктаў.

4. Шматлікія варыянты айконімаў на *-ов / -ово*, *-ев / -ево*, *-ин* (*-ын*) */ -ино* (*-ыно*) абавязаны ўплыву польскай мовы. Напрыклад, у *„вводном листе" запісана: … о вводѣ Витеб. воеводича Ивана Любартовича … во владѣніе … имѣніемъ Неклюдово, леж. въ Орш. пов., съ самымъ дворомъ, w ktorym mieyscu przed tym tego wieś Niekludow była* (ИЮМ, XXV, 422, 1649, Orsz. pow.). Аналагічная з'ява назіраецца і ў наступным завяшчанні на им. *Кичыно*: *Дмитръ Ивановичъ тестаменътомъ остаточъное воли своее именье Кичыно и Буканово … описал двум сыномъ своимъ Федору, Адаму а Михайлу …* (ИЮМ, XXXI, 54, 55, 1601, Вит. в.) – *Kiczyn*: *… naznaczaio sie w przydatek dobra Kiczyn w woiewodstwie Witebskim …* (ИЮМ, XIX, 434, 1712, Wit. w.).

Высокая прадуктыўнасць тапанімічных утварэнняў з прыналежным значэннем аказвала ўплыў на назвы, якія не мелі значэння прыналежнасці. Так, у актах нярэдка фіксуецца суіснаванне дзвюх форм назвы аднаго паселішча – множналікавай і прыналежнай: *Bordziły*, im. / *Борздилово*, им.; *Buławki*, wieś / *Buławkino*, d. і інш. Тлумачыцца такая з'ява тым, што з канца XVI стагоддзя ў сувязі з разлажэннем абшчыннага землеўладання страцілася прадуктыўнасць множналікавай тапанімічнай мадэлі і пад уздзеяннем уласцівай для тапаніміі тэндэнцыі перацягвання структуры найбольш папулярнай мадэлі адбылося пераафрмленне патранімічных назваў па ўзоры прыналежных на *-ов, -ин…*

Тапонімы з фармантамі *-ский* (*-ski*); *-цкий* (*-cki*); *-ская* (*-skaja*); *-цкая* (*-ckaja*), *-ское* (*-skoje*); *-цкое* (*-ckoje*); *-овский* (*-owski*); *-овская* (*-owskaja, -owska*); *-овское* (*-owskoje, -owsko*) у беларускіх пісьмовых крыніцах перыяду Рэчы Паспалітай складаюць крыху больш за 3%. У большасці сваёй назвы дадзенай групы ўяўляюць сабой словазлучэнні, у якіх прыметнікі выступаюць у якасці дыферэнцыруючага азначэння да назоўніка, што абазначае тып паселішча або тып зямельнага ўладання. Пры гэтым род азначальнага кампанента залежыць ад роду наменклатурнага тэрміна. Падобныя найменні ў перыяд XVI–XVIII стст. яшчэ знаходзіліся на стадыі станаўлення ў якасці ўласнатапонімаў. Паводле пісьмовых матэрыялаў ў дадзены перыяд назіраецца распад эліпсаў і тэндэнцыя да субстантывацыі. Назвы гэтага тыпу характарызуюцца рухомасцю, форма іх састаўных частак вызначаецца

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



зменлівасцю і непаслядоўнасцю. Напрыклад, у гістарычных крыніцах канца XVI ст. фіксуецца двухкампанентнае найменне (прыметнік + назоўнік) *Крычынское имење*, у матэрыялах сярэдзіны XVII ст. рэгіструецца назва *Кричино именье*, а ў актах першай палавіны XVIII ст. сустракаецца форма *Kryczyn*, im. Часам у адным і тым жа дакуменце функцыянуюць паралельныя формы: */купчая/ … имѣніе, как сказано въ актѣ, лежачое в повете Витебскомъ, в селе Латыголе, водле именя нашого (Киселей) Выменского и Соколницкого, прозываемое на име Жолнерово и Александрово и иншыми землями и кгрунты того именя Жолънеровского и Александровского, здавна ку нимъ належочыми и прислухаючими…* (ИЮМ, XX, 490, 1599, Вит. п.).

Факты суіснавання структурных варыянтаў у XVI–XVIII стст. мелі масавы характар. Надзвычай часта адзначаюцца паралельныя найменні: састаўныя назвы (прыметнікі на *-ский*… ў спалучэнні з родавым геаграфічным тэрмінам) і субстантываваныя назвы ў афармленні прыналежных суфіксаў *-ов, -ин* …, *-щина*…: *Александровское имение / Александрово*, им.; *Борколабовское именье / Борколабово*, им. / *Ворколабов*, им.; *Жолънеровское именье / Жолнерово*, им.; *Кузминская земля / Кузъминщина,* пуст.; *Лососинъский двор / Лососино*, им.; *Луполовъская слободъка / Луполово,* слободк.; *Пашинское имение / Paszyn*, im. і інш.

Назвы на *-ский*… вар'іруюцца таксама з множналікавымі тапонімамі і патранімічнымі найменнямі на *-ичи*: *Зябицкое село / Зяби*, с.; *Огородницкое именье / Огородники*, им.; *Сапрыновское*, маентн. / *Сапрыновичи*, маетн. і інш.

Тапонімы з фармантам *-щина* (*-щына*, *-szczyna*), *-щизна* (*-szczyzna*), *-овщина* (*-овщына*, *-owszczyzna)* належаць да ліку прадуктыўных фармантаў перыяду XV–XVIII стст., як у сферы агульных імён, так і ў сферы тапаніміі. Уласныя геаграфічныя назвы ў афармленні суфікса *-щина*… з'яўляюцца назвамі зямельных уладанняў: зямель (*Василевщина*; *Локтевщына*; *Малашковщина* і інш.); урочышчаў (*Буловщизна*; *Любъщына*); службаў (*Крывцовщына*); селішчаў (*Отрахимовъщина; Шырейковщына*); пусташаў (*Макаръевщина*; *Maieszczyzna*). Значная частка тапонімаў служыць абазначэннем населеных пунктаў: засценкаў (*Волковщина; Kozlowszczyzna*), *фальваркаў* (*Малаховщызна*; *Jepitachowszczyzna*); двароў (*Офанасовщизна*); дамоў (*Мальковщизна*); слабод (*Lubinszczyzna*); сёл (*Губинщына*; *Марковщина*, *Сергуновщина*) і вёсак (*Гусевщизна*; *Куриловщина*; *Пастуховщизна*). Найбольшую колькасць найменняў дадзенага тыпу складаюць назвы маёнткаў (*Дмитровщина; Mikolszczyzna*; *Orłowszczyzna*).

Назвы з суфіксамі *-щина* (*-щына*), *-овщина* (*-овщына*) фіксуюцца ў дакументах XVI – першай палавіны XVII стст., напісаных на старабеларускай мове. У пачатку XVII ст. пад уплывам граматычнай сістэмы польскай мовы ў помніках з'яўляюцца тапонімы ў афармленні суфікса *-щизна* (*-szczyzna*). На пачатковым этапе нярэдка ўжываюцца два варыянты адной і той жа назвы: з суфіксамі *-щына* і *-щизна: Кіевщына – Киевщизна*; *Корзеевщина – Корзеевщизна, Шашневщина – Шашневщизна; Москалевщина –Maskalewszczyzna.* У польскамоўных помніках другой паловы XVII–XVIII стст., за рэдкім выключэннем, ужываюцца суфіксы *-szczyzna* (*-owszczyzna*).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



Для перыяду XVI–XVIII стст. было ўласціва драбленне зямель на прыватныя ўчасткі, што вяло за сабой павелічэнне колькасці ўласных назваў на *-щина…* З'яўленне ў масавым парадку найменняў на *-щина…* абумовіла станаўленне суфікса *-щина…* як тапанімічнага фарманта са значэннем прыналежнасці. Назвы зямель з фармантам *-щина* ў адзначаны перыяд актыўна пераносіліся на паселішчы, заснаваныя на гэтых землях.

У помніках неаднаразова фіксуюцца структурныя варыянты назваў аднаго і таго ж геаграфічнага аб'екта: 1) з суфіксамі *-szczyna / -szczyzna: Kakowszczyzna / Kakowczyna*; 2) з суфіксам *-щина /* назвы на *-ский, -ское, -ская: Кохановъщина*, зем. / *Кохановъская земля*; *Кузьминщина – Кузминская земля; Любъщына – Любъщынское урочище; Обрамовщина – Обрамовская земля; Юрковщина – Юрковичевская земля;* з суфіксамі *-щина / -ово: Шашневщина*, с. / *Шашнево*, с. і інш. Наяўнасць такіх варыянтаў сведчыць пра барацьбу розных тэндэнцый у сферы намінацыі.

Сярод множналікавых найменняў даволі высокай ступенню прадуктыўнасці вылучаюцца тапонімы з фармантамі *-ичи, -ичы* (*-icze*); *-ычи, -ычы* (*-ycze*), *-овичи, -овичы* (*-owicze*); *-евичи, -евичы* (*-ewicze*); *-иничи, -иничы* (*-inicze*): *Бобиничи*; *Булыжичи*; *Глазомычы*; *Голубичи*; *Karpienicze*; *Rewiatycze*; *Smietanicze*; *Холмичи*; *Космыничы* і інш. З'яўленне структурных варыянтаў суфікса *-ичи…* – суфіксаў *-ицы* (*-усу*, *-усе*, *-ыцы*) абумоўлена ўплывам польскай мовы. У старапісьмовых крыніцах нярэдка назіраецца паралельнае ўжыванне суфікса *-ичи…* (у тапонімах, запісаных у старабеларускіх тэкстах) і *-ицы…* (у польскамоўных тэкстах): *Ознаймуем вашей милости, иж подданые гдрские села Вейны, села Новоселок, села Онискович и Бородчич ускаржалися на мещан могилевских …* (Бел. арх. I, 58, 1603, Мог.) – <*sciana*> *… aż do sianożeci mieskich które nad rzeką Dnieprem leżą, a konczą sie aż pod siołem Borodczycami …* (Бел. арх. I, 66, 1604, Мог.); *Рукшеничи,* им. (ИЮМ, XXV, 372, 1668, Пол. в.) – *Głybokie y Rukszenice, włok 13* (ИЮМ, XXV, 372, 1668, Poł. w.). Актавыя запісы сведчаць, што фармант *-ичи…* часта выступае ў форме, ускладненай суфіксамі *-ов*, *-ин*, якія, як вядома, маюць прыналежнае значэнне. Айконімы з двайнымі фармантамі адносяцца да больш позніх утварэнняў. Суфікс *-евич* выступае не толькі ў якасці палатальнай разнавіднасці суфікса *-ович*. Згодна з паказаннямі пісьмовых, помнікаў замена галоснай *о* на *е* ў суфіксе магла адбыцца пад уздзеяннем фанетычнай сістэмы польскай мовы. Нярэдка даводзіцца сутыкацца з фактамі такой замены ў дакументах XVII ст., калі польская мова актыўна выцясняла беларускую са справаводства (дакументы запісваліся толькі на польскай або на польскай і старабеларускай мовах). Суіснаванне двух фанетычных варыянтаў суфікса *-owicze* (*-iewicze*) назіраецца і ў польскамоўных запісах: *… summe pieniedzy, na maietnosci, wsi Dankiewiczach y Zahoriu …* (ИЮМ, XXVI, 377, 1679, Orsz. pow.) – *Działo sie w Dankowiczach, roku tysioc szescset siedmdziesiot ośmego …* (ИЮМ, XXVI, 378, 1678, Orsz. pow.); *Przybywszy z kraiow Litewskich, z wygnania Moskiewskiego w woiewodztwo Połockie, do maietnosci swych, w wdztwie Połockim leżącey Chrołcewicz …* (ИЮМ, XXVI, 453, 1667, Poł. w.) – <*Василий Плеска-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



*чевскій> … передалъ третью часть maietnosci Chrołkowicz, w Połock. woiew. łeżącey* … (ИЮМ, XXVI, 507, 1671, Poł. w.).

Захоўваліся патранімічныя найменні і ў перыяд з другой палавіны XVI стагоддзя да першай палавіны XVII стагоддзя, у час аграрных пераўтварэнняў ў адпаведнасці з *Уставай на валокі 1577 года*. У выніку рэформы адбывалася індывідуалізацыя сялянскага землеўладання – кожная сялянская сям'я асядала на асобным зямельным надзеле, адпаведна адбываліся падзелы і асобных сем'яў. На месцы службаў і дворышч звычайна з'яўляліся новыя паселішчы: сёлы і фальваркі залежных сялян, якія звычайна пераймалі ўласныя назвы службаў, што ўзыходзілі да патранімічных на *-ичи* ... У феадальную эпоху адбываецца працэс выцяснення патранімічных найменняў з фармантам *-ичи*… найменнямі, якія абазначалі цяглых сялян. Аснова такіх тапонімаў, як правіла, указвала на асабовае імя землеўладальніка: напр., *Войничи*, с. (пан *Криштоф Война*). Аснова тапонімаў неабавязкова з'яўлялася асабовым імем, яна магла ўказваць і на сацыяльнае становішча ўладальніка: *Княжичи*, мьст., с., им.; *Поповичи*, с., а таксама на прыналежнасць паселішча царкве: *Церковь Срѣтенія Христова, въ замкѣ Къ сей церкви принадлежало сельцо Церковичи, отписанное Корсаками* … (ИЮМ, 11, 305, 1630, Пол. в.). Даволі часта сустракаюцца варыянтныя тапонімы, якія адлюстроўваюць імя землеўладальніка і ў той жа час указваюць на сялян, якія яму належаць: *Коптево*, им. / *Коптевичи*, им.; *Микулино*, д. / *Микуличи*, д.; *Сенково*, с. / *Сенковичи*, с. і інш.

Такім чынам, старабеларуская тапанімія перыяду Рэчы Паспалітай адлюстроўвае адзін з найважнейшых этапаў у развіцці беларускай нацыянальнай тапанімічнай сістэмы., які характарызуецца зменлівасцю лексічных асноў тапонімаў, іх структурным пераафармленнем і шматлікімі фанетыка-арфаграфічнымі варыянтамі, выкліканымі беларуска-польскім міжмоўным узаемадзеяннем.

## Пісьмовыя крыніцы

**АВАК** – *Akty, izdawajemyje Wilenskoju archieołogiczeskoju komiccijeju*, w 39 t., t. 1–39, Tip. gubiern. prawlenija, Wilna 1865–1915.

**Бел. арх.** – *Biełaruski archiu*, u 2 t., t. 1: XVI–XVII st. – 268 s.; t. 2: XV–XVI ст. – 343 s., Minsk: Wyd. In-ta bieł. kultury, 1927–1928.

**ИЮМ** – *Istoriko-juridiczeskije matieriały, izwleczionnyje iz aktowych knig gubiernij Witiebskoj i Mogilewskoj*, w 32 вып., wyp. 1–32, Witiebsk 1871–1906.

## Бібліяграфія

**Aleksandrowicz Stanisław**, *Miasta i miasteczka Białorusi i Litwy okolo 1650 r.* (*w granicach Wielkiego Księstwa Litewskiego z 1582 r.*), [Mapa], [w:] *Idem*, *Geneza i rozwój sieci mia-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



*steczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w.*, „Acta Baltico-Slavica” 1970, 7, Białystok: Białostockie Towarzystwo Naukowe, s. 47–108.

**Buczek Karol,** *Dzieje kartografii polskiej od XV do XVIII wieku. Zarys analityczno-syntetyczny*, Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1963.

***Encyklapiedyja historyi Biełarusi***, t. 2, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1994.

*Wialiki histaryczny atłas Biełarusi u 4 tamach*, t. 2, Minsk: „Biełkartahrafija”, 2013, s. 82, 90, 99, 122.

**Jakubowski Jan,** *Mapa Wielkiego Księstwa Litewskiego w połowie XVI wieku*, Kraków: Akademia Umiejętności, 1928.

**Kapyłou Ihar Leanidawicz**, *Pryrodna-hieahraficznaja leksika u ajkanimii biełaruskich dzieławych pomnikau XV– XVIII stst*, [u:] *Biełaruskaja mowa i mowaznawstwa na rubiażу III tysiaczahoddzia*: Materyjały nawyk. kanf., pryswiecz. 70-hoddziu In-ta mowaznawstwa imia Jakuba Kołasa NAN Biełarusi, 2–3 list. 1999 h., In-t mowaznaustwa NAN Biełarusi, Bieł. resp. fond fundamient. dasledawanniau, Minsk 2000.

**Karskij Jewfimij Fiodorowicz**, *Trudy po biełorusskomu i drugim sławianskich jazykam*, Moskwa: Izd-wo Akad. nauk SSSR, 1962.

**Lemciuhowa Walancina Piatrouna**, *Biełaruskaja ajkanimija*, Minsk: „Nauka i tiechnika”, 1970, s. 113.

**Mieleszko Wasilij Iwanowicz**, *Oczerki agrarnoj istorii Wostocznoj Biełorusii* (wtoraja połowina XVII–XVIII ww.), Minsk: „Nauka i tiechnika”,1975.

**Ochmanski Jerzy,** *Powiat kobryński II poł. XVI w*. [Mapa], [w:] *Idem*, *Gospodarka folwarczna dóbr hospodarskich na Kobryńszczyznie: Studium z dziejów folwarku w dobrach na Białorusi. Koniec XV* – pocz. XVII w., „Kwartalnik Historii Kultury Materialnej” 1958, 3, Warszawa.

**Spiridonow Michaił Fiodorowicz**, *Беларусь в конце XVI в.* [Karta s ukazatielem], [w:] *Idem*, *Zakrieposzczenije kriestjanstwa Biełarusi* (*XV–XVI ww.*), Minsk: Nawuka i technika, 1993.

**Topolska Maria Barbara**, *Dobra dereczyńskie od XV do połowy XVII w*., „Zeszyty Naukowe UAM w Poznaniu. Historia” 1971, z. 11, s. 45–70.

## Адміністрацыйныя адзінкі і ўласныя геаграфічныя назвы

Березвецк. монаст. – Березвецкий монастырь

Берест. в. – Берестейское воеводство

Бешенк. (Bieszenk.) – Бешенковичи (Bieszenkowicze)

Борис. пов. – Борисовский повет

Велиж. вол. (Wieliz. wl.) – Велижская волость (wielizska wlosc, wieliska wlosc, wielizka wlosc)

Велиж. стар. (Wieliz. star.) – Велижское староство (wielizskie starostwo, wieliskie starostwo, wielizkie starostwo)

Велиж. у. (wieliz. pow.) – Велижский уезд (wielizski powiat, wieliski powiat, wielizki powiat)

Вит. в. (Wit. w., Witt. w.) – Витебское воеводство (witebskie woiewodstwo, wittebskie woiewodstwo, witebskie wojewodztwo)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



Волков. пов. – Волковыскі повет
Гом. стар. – Гомельское староство
Городенск. пов.– Городенскій повет
Кобр. стар. – Кобринское староство
Лидск. пов. – Лидскій повет
Мог. (Moh., Moch.) – Могилев (Mohilow, Mohylow, Mochilow)
Мстисл. в. (Mscisl. w.) – Мстиславское воеводство (mscislawskie woiewodstwo, mscislawskie wojewodztwo)
Новогор. в. (Новогр. в.) – Новогородское воеводство (Новогродское воеводство)
Orsz. u. (Орш. пов., orsz. pow.) – orszanski uiazd (Оршанский повет, orszanski powiat)
Пинск. пов. – Пинскій повет
Pin. pow. – pinski powiat
Пол. в. (Pol. w.) – Полоцкое воеводство (polockie woiewodstwo, polockie wojewodztwo)
Реч. пов. – Речицкій повет
Siercieysk. woyt. – siercieyskie woytowstwo
Слоним. пов. – Слонимскій повет
Холмск. зем. – Холмская земля
Chrestowsk. woyt. – chrestowskie woytowstwo
Чечерск. стар. (Czeczersk. star.) – Чечерское староство (czeczerskie starostwo)
Чашн. (Czaszn.) – Чашники (Czaszniki)

## Наменклатурныя тэрміны

в. (w.) – воеводство (woiewodztwo,woiewodzwo, województwo)
войт. – войтовство
вол. – волость
гр. (gr., кгр.) – грунт (grunt, кгрунт)
д. (d.) – деревня (derewnia)
дв. (dw.) – двор (dwór)
добр. (dobr.) – добра (dobra)
заст. (zasc.) – застенок (zaścianek)
им. (ым., ym., ыйм., jm.) – именье, имение (ыменье, ymienie, ыйменье, jmienie)
м. (m.) – место (miasto)
маентн. (маетън., маетн., maietn., majetn.) – маентность, маентност (маетъность, маетность, маетност, maietnosc, majętność, majetnost)
мест. (мяст., miast., miest.) – местечко (мястечко, miasteczko, miesteczko)
miestn. (miejsc.) – miestnosc (miejscowość)
н.п. – населены пункт
пов. – повет
с. (s.) – село (sioło)
ur. – uroczyszcze
ф. (f.) – фольварок, фольварк (folwarek, folwark)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/07/2026 05:20:42



знак ? ужываецца ў тых выпадках, калі месца лакалізацыі тапоніма або час ўпамінання яго ў помніку дакладна не ўказаны, а таксама ў выпадках, калі дакладна немагчыма вызначыць тып паселішча

## Streszczenie

Artykuł jest poświęcony białoruskim własnym nazwom geograficzym, które wyekscerpowano z dokumentów urzędowych i map z lat 1569–1795. Przedmiotem analizy są właściwości leksykalno-semantyczne, strukturalno-gramatyczne oraz fonetyczno-ortograficzne toponimów w okresie Rzeczypospolitej. W artykule zwórcono także uwagę na ewolucję analizowanych jednostek toponimicznych.

**Słowa kluczowe:** toponim, ojkonim, wariant fonetyczno-ortograficzny, topoformant

## Рэзюме

У артыкуле разглядаюцца старажытныя беларускія ўласныя геаграфічныя назвы, засведчаныя ў дзелавых помніках пісьменнасці і на картах у перыяд з 1569 па 1795 гады. Аналізуюцца лексіка-семантычныя, структурна-граматычныя і фанетыка-арфаграфічныя асаблівасці тапонімаў у часы Рэчы Паспалітай і асноўныя этапы іх эвалюцыі.

**Ключавыя словы:** тапонім, айконім, фанетыка-арфаграфічны варыянт, тапафармант

## Summary

The article considers the ancient Belarusian proper geographical names attested in written records and maps for the period from 1569 to 1795 years. The lexical-semantic, structural-grammatical and phonetic-orthographic peculiarities of the Polish-Lithuanian Commonwealth place names and main stages of their evolution are analyzed.

**Key words:** toponym, oikonym, phonetic-orthographic variant, topoaffix